Брест, Белостоцкая 42, архивному отделу УНКВД


Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 35 (55) Нядзеля, 26 жніўня 1945 г. Цана 15 кап.


## НОВЫ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД СУСТРЭНЕМ У ДОБРА АДРАМАНТАВАНЫХ ШКОЛАХ

5 дзён засталося да пачатку новага навучальнага года. Дзятвара нашага раёна з нецярпеннем чакае гэтага шчаслівага для яе дня.

Большасць школ раёна поўнасцю падрыхтаваны да прыёма вучняў: адрамантаваны, пабелены, забяспечаны дравамі.

Аднак маюцца факты, калі некаторыя загадчыкі і дырэктары школ не сур'ёзна аднесліся да справы падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года. Так гічыцкая і галенчыцкая пачатковыя школы яглевіцкага сельсовета да гэтага часу не прыведзены ў парадак, не прыстасаваны поўнасцю да заняткаў. Такое-ж становішча і ў школе в. Яблонка Яблонскага сельсовета.

Асабліва ў непрыглядным становішчы знаходзіцца памяшканне школы ў в. Быч Стайкаўскага сельсовета. Быўшы загадчык школы тав. Такарчук Еўгенія на працягу лета нічога не зрабіла для прывядзення школы ў належны парадак. У апошні час з школы раскрадвaецца аконнае шкло.

Трэба адзначыць, што РайАНА (заг. тав. Дзіковіч) дрэнна кіраваў падрыхтоўкай школ да навучальнага года. Работнікі РайАНА ў школах бываюць рэдка і становішча на месцах не ведаюць. У выніку многія школы не забяспечаны партамі і другімі школьнымі прыладамі.

Лічаныя дні асталіся да пачатку вучобы. Але многае можна яшчэ зрабіць, арганізаваць, удакладніць. Загадчыкі школ, настаўнікі павінны прыкласці ўсе сілы, каб наша шчаслівая, жыццерадасная дзетвара прыступіла да заняткаў у добра адрамантаваных, светлых і школах.

## У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭЦЕ КП(б)Б І СОЎНАРКОМЕ БССР

У адпаведнасці з пастановай Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР—Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі і Совет Народных Камісараў БССР абавязалі Дзяржаўную Планавую Камісію пры Совеце Народных Камісараў БССР сумесна з Народнымі Камісарыятамі і абласцямі аблaсці і прадставіць у ЦК КП(б)Б і СНК БССР пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946—1950 гг., кіруючыся ўказаннем ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб тым, што „У пяцігадовым плане маецца на ўвазе прадугледзець поўнае аднаўленне народнай гаспадаркі раёнаў СССР, якія падвергліся нямецкай акупацыі, пасляваенную перабудову народнай гаспадаркі і далейшае развіццё ўсіх раёнаў СССР, у выніку чаго павінен быць значна перавышан даваенны ўзровень развіцця народнай гаспадаркі СССР".

Кантрольныя намёткі пяцігадовага плана па гаспадарцы рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання прадставіць да 1 верасня 1945 года.

## Ратыфікацыя Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

20 жніўня 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР ратыфікаваў Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, падпісаны ў Сан-Франціска (ЗША) 26 чэрвеня 1945 года.

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 21 ЖНІЎНЯ

На працягу 21 жніўня ў Маньчжурыі нашы войскі прадаўжалі прасоўвацца ўперад.

У паўднёвай частцы вострава САХАЛІН нашы войскі занялі гарады СІКІГА, НАЙОРО, УСІЙОРО (УНАРЫ), МАОКА.

За 20 жніўня нашымі войскамі ў Маньчжурыі ўзята ў палон 52 тысячы японскіх салдат і афіцэраў, у тым ліку камандуючы 1 фронтам Квантунскай арміі генерал Кіта Сэйкі, камандуючы 3 фронтам Квантунскай арміі генерал Усіроку Даюн і др.

Прыём капітуліруючых часцей і злучэнняў Квантунскай арміі прадаўжаецца.

### З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 22 ЖНІЎНЯ

На працягу 22 жніўня ў МАНЬЧЖУРЫІ і паўднёвай частцы вострава САХАЛІН нашы войскі прасоўваліся ўперад па зададзеных напрамках.

Нашы авіядэсантныя групы высадзіліся ў гарадах ДАЙРЭН, ПОРТ-АРТУР і прыступілі да раззбраення японскіх гарнізонаў у гэтых гарадах.

У раёне на поўдзень ад КАМЧАТКІ нашы войскі высадзіліся на востраве СЮМУСЮ (паўночны востраў Курыльскай грады). Японскія войскі, размешчаныя на гэтым востраве, пачалі складваць зброю і здавацца ў палон нашым войскам.

За 21 жніўня нашымі войскамі ўзята ў палон 71.000 японскіх салдат і афіцэраў, сярод якіх 20 генералаў.

Прыём капітуліруючых часцей і злучэнняў Квантунскай арміі прадаўжаецца.

СОВІНФОРМБЮРО.

# Сяляне і сялянкі Косаўскага раёна! Дружна падтрымаем заклік сялян в. Яблонка, датэрмінова разлічымся з дзяржавай па нарыхтоўках хлеба і другіх сельгаспрадуктаў!

## У ЯГЛЕВІЦКІМ СЕЛЬСОВЕЦЕ

Сяляне Яглевіцкага сельсовета ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновую здачу хлеба дзяржаве. Зварот сялян і сялянак в. Яблонка Яблонскага сельсовета выклікаў новую патрыятычную хвалю ў хлебаздатчыкаў.

Сяляне вёскі Яглевічы Бахур Іван, Пытляк Елізавета, Молаш Васіль, Пытляк Купрыян і др. выканалі даведзены ім план здачы хлеба дзяржаве на 100 процантаў. Многія сяляне, як Прымак Аляксей, Казлоў Антон, Бахур Емельян, Асіпік Андрэй не толькі выканалі, але і значна перавыканалі план хлебанарыхтоўкі.

На раду з перадавымі сялянамі і сялянкамі ў в. Яглевічы ёсць рад гаспадароў, якія яшчэ не зразумелі важнасці хлебанарыхтоўкі, марудзяць са здачай хлеба дзяржаве. Такія сяляне, як Бахур Восіп, Бахур Анастасія, Пытляк Рыгор Мартынавіч і др. яшчэ не прыступалі да выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы хлеба. Не поўнасцю выканалі даведзены план хлебанарыхтоўкі гаспадаркі Пекарскага, Міхінкевіча Васіля, Бахура Івана і Бахура Якава.

Дрэнна ідзе здача хлеба ў вёсках Галенчыцы і Гічыцы. Адстаюць і Яглевіцкія хутары.

Яглевіцкі сельсовет мае ўсе магчымасці быць перадавым сельсоветам у справе нарыхтоўкі хлеба. Выканкому сельсовета і яго ўпаўнаважаным неабходна ўзмацніць кіраўніцтва хлебанарыхтоўкай, улічваючы, што ўжо час прыступіць і да сяўбы азімых. Для гэтага трэба шырока папулярызаваць выдатныя прыклады перадавых сялян, весці нястомную растлумачальную работу сярод насельніцтва, прымяняць усю сілу совецкіх законаў да злосных неплацельшчыкаў.

Т. ШАЛОНІНА.

## Вынікі соцыялістычнага спаборніцтва

Усе вёскі Стайкаўскага сельсовета спаборнічаюць паміж сабой за датэрміновае выкананне плана здачы хлеба дзяржаве.

21 жніўня Выканком сельсовета падвёў вынікі соцыялістычнага спаборніцтва.

Выканком сельсовета адзначыў, што першае месца у соцыялістычным спаборніцтве па хлебапастаўках заняла в. Аўсто (упаўнаважаны сельсовета ў вёсцы т. Шыш), сяляне якой выканалі план хлебанарыхтоўкі на 64 проц. Другое месца заняла в. Міхнавічы (упаўнаважаны с. с. т. Белая). План пастаўкі хлеба выканан на 50 проц. Трэцяе месца заняла в. Алексейкі. План хлебанарыхтоўкі выканан на 35 проц.

Выканком сельсовета адзначыў дрэннае кіраўніцтва справай нарыхтоўкі хлеба з боку ўпаўнаважаных сельсовета ў в Быч т. Трацяка в. Размеркі—т. Мурашка і в. Стайкі—т. Шыяна і абавязаў іх рашуча палепшыць становішча нарыхтоўкі хлеба кожнага ў сваёй вёсцы.

А. К.

## УСУРЫЙСКІ ЯНОТ У БЕЛАРУСІ

10 год назад у Парыцкі раён, Бабруйскай області, былі завезены з усурыйскіх лясоў 50 жывых янотаў. Тут звяркі добра акліматызаваліся. За годы вайны яноты яшчэ больш размножыліся. Зараз у Беларусі ўжо налічваецца некалькі тысяч усурыйскіх янотаў. (БЕЛТА).

## Падатковыя льготы дэмабілізаваным

Совет Народных Камісараў СССР прыняў пастанову аб захаванні падатковых льгот для дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі і членам іх сем'яў.

Гаспадаркам дэмабілізаваных поўнасцю захоўваюцца ў 1945 годзе льготы па сельскагаспадарчаму падатку, якімі яны карысталіся да звароту ваенна-служачых з арміі.

Дэмабілізаваныя з Чырвонай Арміі вызваляюцца ад ваеннага падатку ў 1945 г. Для членаў іх сем'яў захоўваюцца ў гэтым годзе льготы па ваеннаму падатку, якімі яны карысталіся да звароту ваеннаслужачых.

На адзін год з дня дэмабілізацыі для дэмабілізаваных і іх жонак захоўваюцца льготы па падатку на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных.

(ТАСС).

## Прадстаячае падпісанне акта аб капітуляцыі Японіі

ЛОНДАН, 22 жніўня. (ТАСС). Як перадае Лонданскае радыё, у Маніле (Філіпіны) афіцыяльна аб'яўлена, што акт аб капітуляцыі Японіі будзе падпісан 31 жніўня на амерыканскім лінкоры „Місуры" ў Токійскай бухце. Калі пагода будзе спрыяючай 28 жніўня на аэрадроме ў раёне Токіо высадзяцца саюзныя парашутныя войскі. Адначасова ваенна-марскія і паветраныя сілы высадзяцца ў парту каля ўвахода ў Токійскую бухту.

## Г. М. Дзімітраў—кандыдат у Народны Сход Балгарыі

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР задаволіў просьбу дэпутата Совета Саюза Дзімітрава Георгія Міхайлавіча аб вызваленні яго ад абавязкаў дэпутата Вярхоўнага Совета СССР і аб яго выхадзе з грамадзянства СССР з прычыны вылучэння яго кандыдатуры па спіску Айчыннага фронта ў Народны Сход Балгарыі.

Адказны рэдактар А. П. РУДОЙ.

ГЛ 15282 Адрас рэдакцыі: Івацэвічы, вул. Шасейная, 11.